## Круглый стол
## «ЧЕЛОВЕК И ЯЗЫКИ В СОВРЕМЕННОМ МИРЕ»

**А. Аляшкевіч**

### ПТУШКІ БАЦЬКАЎШЧЫНЫ: АДКУЛЬ ЯНЫ ЛЯЦЯЦЬ?

Прадметам даследавання стаў спіс птушак Бацькаўшчыны з 229 назваў. Большасць назваў птушак, паводле наменклатуры, складаюцца з двух словаў, але на сённяшні момант нас цікавяць толькі назвы родавай катэгорыі без відавых азначэнняў. Таму з 229 лексічных адзінак мы абралі 124 для вызначэння іх этымалагічнага паходжання.

Мы вызначылі 8 груп, у якія ўвайшлі 69,4 % лексічных адзінак. Астатнія 30,6 % не былі прымеркаваныя ні да адной з 8 груп па трох прычынах: па-першае, 10,5 % (13 лексічных адзінак) былі запазычанымі; па-другое, 8 лексічных адзінак маюць некалькі тлумачэнняў свайго паходжання; пласт словаў, этымалогію якіх не атрымалася знайсці па лексікаграфічных крыніцах, склаў 13,7 % (17 словаў). Усе гэтыя адзінкі выклікаюць вялікую цікавасць і стануць аб'ектам нашай пільнай ўвагі на наступным этапе даследавання.

Далей мы разгледзім кожную з 8 груп падрабязней.

Да гукапераймальных адносяцца 36 лексічных адзінак, ці 29 % ад вызначанай агульнай колькасці: *гагач, гогаль, грак, груган, гусь, драч, дзяцел, дрозд, зуёк, зязюля, канюх, каўка, кіркун, кнігаўка, коўра, крумкач, крычка, кугакаўка, кулік, перапёлка, пугач, сава, савук, свіргуль, сініца, сыч, сычык, туркаўка, удод, уюрок, цвыркун, цецярук, чайка, чыж, шчыгел, юрок.*

Назвы паводле дзеяння склалі 13 адзінак, ці 10,5 %: *аляпка, дзяцел, каршун, круцігалоўка, ластаўка, нырок, пагоніч, папаўзень, пастушок, паўзунок, перасмешка, рыбачка, чапля.*

Паводле колеру мы вызначылі 11 словаў, ці 8,9 %,: *арабок, бусел, голуб, зелянушка, лебедзь, малінаўка, рудахвостка, салавей, сарока, сіваграк, чырвонаваллёвік.*

Група назваў па трактоўцы паводзінаў адна з нешматлікіх, бо паводзіны, на наш погляд, не звязаныя з першасным успрыманнем аб'екта; трактоўка сведчыць пра тое, што назва была апрацавана кагнітыўнай дзейнасцю. Да іх было аднесена 7 назваў (5,7%): *авяльга, зябок, зімародак, каменяшарка, крывок, сеўка, сявец.*

Паводле ўзнешніх прыкмет ёсць таксама 7 назваў, ці 5,7 %: *валавока, крыжанка, крыжадзюб, курапатка, лыска, сойка, таўстадзюб.*

Паводле біятопу было вызначана 6 лексічных адзінак, што склала 4,8 %: *падкаменка, пясочнік, пясчанка, пячураўка, чаротаўка, чаротніца.*

Назвы паводле харчавання маюць найбольш відавочную ўнутраную форму. Да іх адносяцца 4 назвы (3,2 %): *арэхаўка, асаед, канаплінка, рабіннік.*

Паводле асаблівых біялагічных прыкмет мы вылучылі 2 словы (1,6 %): *глушэц і лунь.*

Большасць назваў птушак Беларусі маюць гукапераймальны характар: чалавек схільны даваць назву прадметам, якія можа пабачыць ці пачуць, паводле адчувальнага ўспрымання іх.